На паліцу

# ПРА ВЫСОКАЕ І ЗЯМНОЕ

**Сёлета адна з вялікіх святынь хрысціянскага свету — Жыровіцкі Свята-Успенскі стаўрапігіяльны мужчынскі манастыр — адзначае адразу два юбілеі: 550-годдзе з'яўлення абраза Жыровіцкай Маці Божай (гэту ўнікальную рэліквію прызналі цудатворнай і праваслаўная, і каталіцкая канфесіі) і паўтысячагоддзе з часу заснавання самой абіцелі. Цікавасць да знакавых дат вялікая як у Беларусі, так і далёка за межамі нашай краіны.**

Маштабныя ўрачыстасці ў Жыровічах у сувязі са складанай эпідэміялагічнай сітуацыяй давялося адкласці — хутчэй за ўсё, іх перанясуць на некалькі месяцаў. Але падарункі да свайго свята адзін з найстарэйшых праваслаўных цэнтраў Беларусі ўсё ж атрымае — прынамсі, іх падрыхтавалі некалькі айчынных выдавецтваў.

Як нядаўна ўжо расказвала «Звязда», энцыклапедычны даведнік **«Жыровічы: пад святым пакровам»** тыражом 1000 асобнікаў убачыць свет у «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі». Выданне, укладальнікам якога стаў прарэктар па навуковай рабоце Мінскай духоўнай семінарыі і Мінскай духоўнай акадэміі Аляксандр Слесараў, утрымлівае разнастайную інфармацыю пра гісторыю і сучаснае жыццё абіцелі і аграгарадка Жыровічы, пра цудадзейны абраз Божай Маці, пра лёсы царкоўных дзеячаў, чыя духоўна-асветніцкая праца была звязаная з манастыром, пра царкоўна-археалагічны музей Мінскай духоўнай семінарыі, а таксама пра тыя помнікі культуры і мастацтва, якія ў свой час знаходзіліся ці дагэтуль захоўваюцца ў Свята-Успенскім манастыры. Напрыклад, анансуе дырэктар выдавецтва Вольга Ваніна, асобныя артыкулы падрабязна раскажуць пра Жыровіцкі ірмалагіён — помнік спеўнай культуры першай паловы XVII стагоддзя, славутае Евангелле Сапегі альбо так званую Жыровіцкую «Энцыклапедыю» XVI стагоддзя — унікальны рукапісны зборнік, па сутнасці, першае даведачна-энцыклапедычнае выданне на тэрыторыі Беларусі.

Аўтарамі больш чым 180 артыкулаў, якія ўвайшлі ў зборнік, выступілі вядомыя рэлігійныя дзеячы, даследчыкі царкоўнай гісторыі, мастацтвазнаўцы. Асноўная мова энцыклапедыі — беларуская, але частка артыкулаў прадубляваная на рускай і англійскай мовах. Кніга аздоблена вялікай калекцыяй ілюстрацый.


Дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» раскрывае тэму па-свойму — праз кнігу паэзіі **«Святло з Жыровіч»**. Яе аўтар, чалавек надзвычай цікавага і пакручастага лёсу, — сын вядомага скульптара, былы выкладчык музыкі, філосаф, публіцыст Алег Бембель, ён жа **паэт Зніч,** які ўжо шмат гадоў непарыўна звязаны са святым месцам. Ён прайшоў шлях ад смяротна хворага паслушніка Алега да інака Мікалая і манаха Іаана, насельніка Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра, і з цягам часу менавіта вера стала адным з асноўных матываў ягонай творчасці. Хоць тэма веры і духоўнасці, сцвярджае дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, наогул уласцівая для беларускай літаратуры, нават нягледзячы на даволі працяглы перыяд бязбожнасці, калі ўсё, што датычылася рэлігіі, Бога, выкрэслівала цэнзура. У якасці доказу выдавец прыводзіць анталогію беларускай хрысціянскай паэзіі, над якой «Мастацкая літаратура» працуе з нядаўняга часу, — у ёй налічваецца больш за 100 імёнаў аўтараў, ад класікаў (хто ж не згадае «Маю малітву» Янкі Купалы, якая дзякуючы кампазітару Алегу Молчану і «Песнярам» стала помнікам не толькі літаратурным, але і музычным) да сучаснікаў. А значыць, паэтычныя развагі пра веру і духоўнасць знойдуць свайго чытача і цяпер.






Кніга вядомага беларускага мастацтвазнаўца, музейшчыка **Аляксандра Ярашэвіча «Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр»** ужо выходзіла ў выдавецтве «Беларусь» больш за 10 гадоў таму. Але сёлета яно было практычна цалкам абноўлена, у прыватнасці, наноў сабралі ілюстрацыйны матэрыял, які адлюстроўвае інтэр'еры і дэкор манастыра, паказвае від на Жыровічы з вышыні птушынага палёту і ў дэталях разглядае абразы... Асаблівасць кнігі, як кажа спецыяліст выдавецтва Анжэла Садоўская, у тым, што аўтар абапіраўся на навуковыя факты і даследаванні, але пры гэтым сціслa, ёміста і даступна для самага шырокага кола чытачоў распавёў гісторыю Жыровіцкага манастыра з часу заснавання да нашых дзён. Гэты аповед на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай — маляўніча афармлены ў падарункавым выданні і адрасаваны шматлікім паломнікам, якія штогод прыязджаюць у абіцель.

Другая кніга, якую рыхтуе выдавецтва «Беларусь» да юбілею хрысціянскай святыні, — **«Цяпло Жыровіцкай святыні»** вядомага слонімскага краязнаўца, журналіста і пісьменніка **Сяргея Чыгрына.** Аўтар навукова-папулярнага даследавання шмат часу правёў у архівах Украіны, Польшчы і Літвы, збіраючы малавядомыя факты не толькі пра манастыр, але і наогул пра Слонімшчыну, гісторыю сваёй малой радзімы і не славутых ураджэнцаў. Як плануецца, гэтая кніга ўбачыць свет у канцы мая.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# «РАСНАФТА» ВЫВУЧЫЦЬ... КЛЮЧАВЫХ ЖЫВЁЛ АРКТЫКІ



**Некранутая прырода Арктыкі захоўвае мноства таямніц, якія чалавеку яшчэ трэба будзе разгадаць. Але зрабіць гэта далікатна, бо стаіць задача захаваць такую ж далікатную экасістэму Арктыкі, яе біялагічную разнастайнасць.**



Праграма стала працягам маштабных даследаванняў белых мядзведзяў, маржоў і паўночных аленяў, выкананых «Раснафтай» у 2014–2018 гадах, па выніках якіх быў сабраны і сістэматызаваны ўнікальны навуковы матэрыял аб сучасным стане жывёл, што жывуць у Арктыцы.

**Станіслаў ЗАЛАТЫ, дырэктар запаведніка «Ненецкі»,** падкрэслівае, што Арктыка — сапраўды ўнікальная прырода, унікальныя людзі, унікальны жывёльны свет. І задача стаіць глабальная: вывучыць і захаваць унікальную прыроду Арктыкі.

Нафтавая кампанія «Раснафта» пачала рэалізацыю праграмы ацэнкі ўстойлівасці арктычных экасістэм на падставе даследавання ключавых відаў арктычных жывёл: белага мядзведзя, атлантычнага маржа, дзікага паўночнага аленя і белай чайкі. У перыяд да 2023 года ўключна кампанія правядзе 8 экспедыцый на мора Лапцевых, Баранцава і Карскае моры.

Падчас анлайн-прэзентацыі праграмы **Міхаіл ЛЯВОНЦЬЕЎ, прэс-сакратар «Раснафты»**, паведаміў: «Стратэгія кампаніі нацэлена на максімальна беражлівае стаўленне да навакольнага асяроддзя, захаванне біялагічнай разнастайнасці». Маштаб маючых адбыцца даследаванняў стане беспрэцэдэнтным у гісторыі вывучэння рэгіёна. Навуковая работа ў такіх аб'ёмах раней у Арктыцы не ажыццяўлялася.

Так, напрыклад, апошнія глабальныя назіранні паўночных аленяў праводзіліся больш чым трыццаць гадоў таму. Сёння патрэбныя новыя веды аб стане папуляцыі.

*«Раснафта» рэалізуе праграму захавання біялагічнай разнастайнасці Арктыкі, клапоцячыся пра яе бяспечнае асваенне ў далейшым і захаванне яе ўнікальных экасістэм. Праграма прадугледжвае даследаванні марскіх экасістэм, назіранні за відамі жывёл, якія з'яўляюцца індыкатарамі экасістэмы Арктыкі, таксама ўключае навукова абгрунтаваную ацэнку адчувальнасці тэрыторыі і месцаў пражывання, распрацоўку рэкамендацый па арганізацыі маніторынгу стану экасістэм.*

У рамках экспедыцый плануецца правесці больш за 170 гадзін авіяцыйных даследаванняў, у тым ліку пры дапамозе беспілотных лятальных апаратаў. Аэраздымка будзе праведзена на плошчы звыш 500 тысяч квадратных кіламетраў. У ходзе больш чым 200 сутак палявых назіранняў плануецца выканаць пазначэнне і кальцаванне звыш 100 асобін жывёл і птушак, адабраць больш за 1000 біялагічных узораў для наступнага лабараторнага аналізу. Пасля правядзення палявых даследаванняў аналіз атрыманых матэрыялаў будзе праводзіцца ў 10 лабараторыях краіны, у тым ліку рэгіянальных. Плануецца правесці некалькі тысяч аналізаў.

ИНН 7702420062.